*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 ЛІСТАПАДА 2007 г. АЎТОРАК

№ 220 (26085)

Кошт 380 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Увага: «прамыя лініі»!

## ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

На ўсе вашы пытанні, якія датычацца ролі і месца народных традыцый у сённяшнім жыцці, а таксама некаторых аспектаў народнай медыцыны, адкажуць падчас «Прамой лініі» нашы пастаянныя аўтары **загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў кандыдат філалагічных навук Іван Іванавіч (Янка) КРУК і старшы выкладчык гэтай жа кафедры Аксана Веніямінаўна КАТОВІЧ.**

**ТЭЛЕФАНУЙЦЕ ЗАЎТРА, 21 ЛІСТАПАДА,** на нашу «Прамую лінію» **з 12.00 да 14.00 па нумарах: 292 38 92, 292 38 21. (Кантактны тэлефон для папярэдніх званкоў — 292 21 03.)**

## ЗДАРОЎЕ ЖАНЧЫНЫ — ЗДАРОЎЕ НАЦЫІ

На любыя вашы пытанні, паважаныя жанчыны, адкажуць унікальныя мужчыны, аўтары ўсіх сучасных падручнікаў па акушэрству і гінекалогіі для будучых беларускіх спецыялістаў (студэнтаў і навучэнцаў) у агучанай галіне прафесар кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук **Іван Уладзіміравіч ДУДА**, дацэнт кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук **Віталь Іванавіч ДУДА**, дацэнт кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук **Уладзімір Іванавіч ДУДА**.

«Прамая лінія» адбудзецца **23 лістапада, у пятніцу, з 15.00 да 17.00** па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).

Падпіска-2008

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫ ГОД

**ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ І І ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» (у рублях)**

| *Індэкс* | *на 1 месяц* | *на 3 месяцы* | *на 6 месяцаў* |
|---|---|---|---|
| **63850 (індывідуальны)** | **8800** | **26400** | **52800** |
| **63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)** | **8300** | **24900** | **49800** |
| **63858 (ведамасны)** | **14000** | **42000** | **84000** |
| **63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)** | **12800** | **38400** | **76800** |
| **ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ І І ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» «Да запатрабавання» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)** | | | |
| **63850 (індывідуальны)** | **7460** | **22380** | **44760** |
| **63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)** | **6990** | **20970** | **41940** |
| **63858 (ведамасны)** | **9938** | **29814** | **59628** |
| **63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)** | **9431** | **28293** | **56586** |

## Сёння — Усеагульны дзень дзяцей




**У Палацы Рэспублікі адбылося адкрыццё Рэспубліканскай мастацкай выстаўкі работ спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. У выстаўцы ўдзельнічае таленавітая моладзь з усіх рэгіёнаў Беларусі. Узрост удзельнікаў — ад 13 да 31 года.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### НАПРЫКАНЦЫ ТЫДНЯ ІСТОТНА ПАЦЯПЛЕЕ

**У першай палове тыдня надвор'е ў Беларусі будзе фарміравацца пад уплывам актыўнага антыцыклону з цэнтрам над Украінай, таму ападкаў не прадбачыцца, — паведамілі рэдакцыі спецыялісты Рэспубліканскага гідраметцэнтра.**

Тэмпература паветра ўначы ад 0 да мінус 7 градусаў, па ўсходзе — да 9 марозу, удзень — мінус 1—плюс 5 градусаў, у чацвер па Брэсцкай вобласці ўдзень — да 7 цяпла. У пятніцу ўдзень па захадзе, а 24 і 25 лістапада па большай частцы краіны чакаюцца цёплыя дажджы. Тэмпература паветра на выхадныя ўначы — ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, удзень — 1—6 цяпла, у паўднёвых раёнах краіны — да плюс 8 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### НЕ БУДЗЕ РЭЗКАГА РОСТУ ЦЭНАЎ

**У Беларусі ў 2008 годзе не будзе рэзкага росту цэнаў на будматэрыялы, у тым ліку на цэмент. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Уладзімір Малец.**

Паводле яго слоў, павышэнне з 1 студзеня 2008 года ў рэспубліцы цэнаў на энерганосьбіты не зможа не адбіцца на кошце будматэрыялаў. Але рост цэнаў на іх будзе адэкватны. Нягледзячы на завяршэнне будаўнічага сезону, у лістападзе попыт на цэмент у Беларусі ніколькі не знізіўся.

### У СТУДЗЕНІ—ВЕРАСНІ ЗАРЭГІСТРАВАНА 64 ТЫС. 410 ШЛЮБАЎ І 26 ТЫС. 459 РАЗВОДАЎ

**Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу рэспублікі.**

У Мінстаце адзначылі, што за дзевяць месяцаў 2007 года ў параўнанні з аналагічным мінулагоднім перыядам колькасць зарэгістраваных шлюбаў павялічылася на 7,1 працэнта, колькасць разводаў узрасла на 14,8 працэнта. Пагоршыліся суадносіны рэгіструемых і скасаваных шлюбаў, падкрэслілі ў статыстычным ведамстве. Так, калі ў студзені—верасні 2006 года на 1000 шлюбаў прыпадала 383 разводы, то ў студзені—верасні 2007-га — ужо 411.

### У АБАРАЧЭННІ — НОВАЯ СЕРЫЯ МАНЕТ

З сённяшняга дня Нацыянальны банк Беларусі выпускае ў абарачэнне першыя памятныя манеты новай серыі «Беларускія народныя легенды» — «Легенда пра бусла», паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.




Сярэбраная манета мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925 і масу 33,62 грама, а медна-нікелевая выпушчана наміналам 1 рубель і масай 15,50 грама.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### «ІЗУМРУДНА-АЛМАЗНАЯ» ГАНДЛЯРКА

**У Мінску супрацоўнікамі падраздзяленняў па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС і Заводскога РУУС была затрымана 28-гадовая жанчына, якая папалася на збыце каштоўных камянёў.**

Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, рабочая аднаго з таварыстваў, якая парушыла правілы аб здзелках з каштоўнымі металамі і камянямі, была затрымана з агранёнымі прыроднымі алмазамі і прыродным ізумрудам ля аднаго з дамоў на вуліцы Чайкінай. У яе канфіскавана 33 алмазы і ізумруд.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ПЕТАРДА І ГАЗ

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-цэнтры УУС Віцебскага аблвыканкама, вучань 8 класа ўвечары кінуў петарду ў газавы люк, што паміж праспектам Будаўнікоў і вуліцай Чкалава. Выбухнуў кандэнсат прыроднага газу. Газаправод не быў пашкоджаны. Вучань з тэрмічнымі апёкамі шпіталізаваны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ЗАБОЙЦУ ШУКАЛІ СЕМ ГАДОЎ

І знайшлі. Супрацоўнікі міліцыі. А ўсё пачалося з таго, што некуды нечакана знік жыхар вёскі Гамза Светлагорскага раёна.

Аднак міліцыя пошукаў яго не перапыняла. І вось ужо — доказы: чалавека забіў у лесе жыхар той жа вёскі ў час сумеснай выпіўкі. Забойца прызнаўся ва ўсім і на дзесяць гадоў трапіў у калонію ўзмоцненага рэжыму.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Узнагароды работнікам прамысловасці, адукацыі, культуры, журналістам

Прэзідэнт Беларусі адзначыў дзяржаўнымі ўзнагародамі работнікаў прадпрыемстваў аптычнага прыборабудавання, дарожна-будаўнічай галіны, чыгуначнага транспарту, культуры, ваеннаслужачых. Адпаведны ўказ Аляксандр Лукашэнка падпісаў 15 лістапада.

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны генеральны дырэктар Беларускага оптыка-механічнага аб'яднання «БелОМА» — дырэктар ВРУП «Мінскі механічны завод імя С.І. Вавілава» Вячаслаў Бурскі.

Медалём «За адзнаку ў воінскай службе» адзначаны капітан Міхаіл Караткевіч, медалём «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай граніцы» — маёры Вадзім Бірылка і Аляксандр Любчанка. Сярод узнагароджаных медалём «За працоўныя заслугі» генеральны дырэктар ААТ «Камунарка» Ніна Атаманава, дырэктар Гомельскага вагонарамонтнага завода імя М.І. Калініна Ігар Красноў, генеральны дырэктар ААТ «Нярудпрам» Міхаіл Дубовы. Гэтай узнагародай адзначаны таксама супрацоўнікі Мінскага гарадскога ўпраўлення статыстыкі, Нацыянальнага цэнтра законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Беларусі, Палаца Рэспублікі, работнікі Мінскага механічнага завода імя С.І. Вавілава, прадпрыемства «Белгеалогія». Галоўны дырыжор Прэзідэнцкага аркестра дзяржаўнай установы «Палац Рэспублікі» Віктар Бабарыкін узнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Гэтага медаля ўдастоены і старшыня Віцебскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Тамара Гусачэнка, дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская, мастацкі кіраўнік прадзюсарскага цэнтра ўнітарнага прыватнага гандлёва-вытворчага прадпрыемства «Спамаш» Уладзімір Кандрусевіч, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр Марціновіч, загадчыца кафедры беларускай літаратуры і культуры Белдзяржуніверсітэта Таццяна Шамякіна.

Ганаровае званне «Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь» прысвоена генеральнаму дырэктару камунальнага праектна-рамонтна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельаблдарбуд» Вадзіму Краўчанку.

Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена работнікам прамысловасці, сферы адукацыі і фізічнай культуры, журналістам, ваеннаслужачым. Адпаведнае распараджэнне Аляксандр Лукашэнка падпісаў 15 лістапада. За шматгадовую плённую работу, значны ўклад у развіццё беларускага машынабудавання Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена работнікам ААТ «Амкадор» Андрэю Герману, Івану Карнацэвічу, Мікалаю Купцову, Генрыку Мураўскаму, Валерыю Эрму.

За плённую педагагічную дзейнасць, заслугі ў развіцці фізічнай культуры і спорту Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена супрацоўнікам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры: прарэктару па навучальнай рабоце Уладзіміру Васілеўскаму, дэкану спартыўна-педагагічнага факультэта масавых відаў спорту Міхаілу Корбіту, загадчыку кафедры спартыўна-баявых адзінаборстваў і спецыяльнай падрыхтоўкі Віктару Барташу, а таксама намесніку старшыні Беларускага грамадскага аб'яднання «Ветэраны фізічнай культуры і спорту» Сяргею Макаранку. Начальніку ўпраўлення рэабілітацыі пацярпелых тэрыторый Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Генадзю Анцыпаву Прэзідэнт аб'явіў Падзяку за распрацоўку і рэалізацыю дзяржаўных праграм па мінімізацыі і пераадоленню наступстваў катастрофы на ЧАЭС.

За дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў, значны ўклад у развіццё вытворчасці будаўнічых матэрыялаў Падзякі прэзідэнта ўдастоены начальнік вытворчасці азбестацэментных вырабаў ВРУП «Крычаўцэментнашыфер» Сяргей Кузняцоў, генеральны дырэктар ААТ «Гомельбудматэрыялы» Алег Сейбель, прараб управлення спецыяльных работ нумар 5 будаўнічага рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства «Віцебскі домабудаўнічы камбінат» Павел Шаляшкоў.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў заслугі ў навукова-педагагічнай дзейнасці, падрыхтоўку высокакваліфікаваных педагагічных кадраў прафесара кафедры прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Ірыны Новік. Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена намесніку старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю — дырэктару дэпартамента фінансавых расследаванняў Сяргею Бараноўскаму, дырэктару Нацыянальнага цэнтра законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Беларусі Валерыю Міцкевічу, а таксама ваеннаслужачым — капітанам Аляксандру Ахрамію і Мікалаю Шкрэду за высокае прафесійнае майстэрства, узорнае выкананне службовых абавязкаў.

Прэзідэнт таксама аб'явіў Падзяку прадстаўнікам СМІ: рэдактару аддзела газеты «Звязда» Наталлі Карпенка за значны асабісты ўклад у развіццё беларускай журналістыкі і дырэктару Прадстаўніцтва МДТРК «Мір» у Рэспубліцы Беларусь Людміле Сідаровіч за заслугі ў фарміраванні і развіцці міждзяржаўнай інфармацыйнай прасторы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

***Звяздоўцы віншуюць сваіх калег з узнагародай!***

### НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ ЗНОЙДЗЕНЫ СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ

Як вядома, у вёсцы Юравічы Калінкавіцкага раёна сёлета працягваліся работы археалагічнай экспедыцыі Нацыянальнай акадэміі навук. Як расказвае гісторык, кіраўнік гомельскай групы Яўген Малікаў, менавіта ёй удалося знайсці самыя важныя знаходкі археалагічнага сезона — два слуцкія паясы, а калі дакладней, дык рэшткі іх. Унікальная знаходка на тэрыторыі Гомельшчыны — першая. Паясы праляжалі ў зямлі звыш двухсот гадоў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ Ў СУВЯЗІ З ТРАГЕДЫЯЙ НА ШАХЦЕ ВА УКРАІНЕ

У сувязі з трагедыяй на шахце імя Засядзькі ў Данецку, якая прывяла да шматлікіх чалавечых ахвяраў, кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў глыбокія спачуванні прэзідэнту Украіны Віктару Юшчанку, родным і блізкім загінулых.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

ISSN 1990 - 763X

07220>

9771990763008

## У Беларусі да 2010 года плануецца павялічыць выпуск будматэрыялаў у 2—2,5 раза да аб'ёму 1990-х гадоў

Аб перспектывах развіцця будаўнічай галіны рэспублікі Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку 19 лістапада далажыў міністр архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр Селязнёў.

Паводле слоў міністра, у краіне ўжо дасягнуты аб'ём вытворчасці будаўнічых матэрыялаў 1990-х гадоў, а па некаторых з іх, напрыклад сценавых матэрыялах, жалезабетонных і бетонных вырабах, нават перавышае ў 4-5 разоў. Аднак па-ранейшаму ёсць недахоп будаўнічых матэрыялаў і канструкцый у сувязі з будаўніцтвам, якое інтэнсіўна вядзецца ў рэспубліцы.

У Беларусі вытворчасць газасілікатных блокаў будзе павялічана ў 1,5 раза. Нарасціць іх аб'ёмы дасць магчымасць адкрыццё новых ліній на прадпрыемствах у Бярозе, Маладзечне, Мінску, г.п. Краснасельскім. Плануецца стварэнне аднаго-двух новых цагельных заводаў. У рэспубліцы таксама актыўна вядзецца мадэрнізацыя існуючых заводаў па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.

Абмяркоўвалася таксама пытанне будаўніцтва спартыўных збудаванняў у раённых цэнтрах. Прынята рашэнне, што ў райцэнтрах будуць узводзіцца невялікія лядовыя пляцоўкі, абсталяваныя ўсім неабходным для навучання і правядзення трэніровак па фігурным катанні, хакеі. Прычым будавацца яны будуць з максімальным выкарыстаннем беларускіх матэрыялаў. Будаўніцтва невялікіх аб'ектаў, коштам не больш як $4-5 млн, эканамічна больш апраўданае. Кіраўнік дзяржавы даручыў дапрацаваць праектна-каштарысную дакументацыю для тыпавых спартыўных збудаванняў, што адпавядаюць усім сусветным стандартам.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

### РЭАЛЬНЫ ПАМЕР ПЕНСІЙ У КАСТРЫЧНІКУ ЎЗРОС НА 10,6 ПРАЦЭНТА

Сярэдні памер прызначанай месячнай пенсіі ў кастрычніку гэтага года склаў у Беларусі Br302,2 тыс., паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу.Паводле даных статыстычнага ведамства, сярэдні памер пенсіі па ўзросту ў кастрычніку гэтага года склаў Br316 тыс., па інваліднасці — Br279,2 тыс., з нагоды страты кармільца — Br190,9 тыс., сацыяльнай пенсіі — Br122,5 тыс. Сярэдні памер прызначанай месячнай пенсіі ў кастрычніку 2006 года склаў у Беларусі Br248,5 тыс. Гэта складала 108,6 працэнта велічыні сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і пенсіянераў.

### ПАВЕЛ ЯКУБОВІЧ ПРАІНФАРМАВАЎ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ АБ ВЫНІКАХ ПЕРАГАВОРАЎ З КІРАЎНІЦТВАМ ІЗРАІЛЯ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 19 лістапада прыняў з дакладам галоўнага рэдактара газеты «Советская Белоруссия» Паўла Якубовіча.

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб выніках рабочай паездкі ў Ізраіль і праведзеных там афіцыйных сустрэчах з прэзідэнтам Ізраіля Шымонам Перэсам, кіраўніцтвам урада і дэпутатамі кнесета, сустрэчах з кіраўнікамі грамадскіх арганізацый, духоўнымі лідэрамі.

У час даклада закрануты таксама пытанні, якія датычацца дзейнасці друкаваных выданняў Беларусі.

**УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона) совместно с государственным учреждением «Главное хозяйственное управление» Управления Делами Президента Республики Беларусь**

проводят открытый аукцион по продаже находящегося в республиканской собственности не завершенного строительством капитального строения «Пристройка к дому № 12 по ул. Мельникайте в г. Минске». Площадь объекта продажи по периметру — 570 кв.м Площадь земельного участка — 0,094 га. Начальная цена — 915 920 000 белорусских рублей.

Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта (91 592 000 белорусских рублей) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем заключается в течение 15 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона.

Аукцион состоится 21 декабря 2007 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 20 декабря 2007 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Порядок подачи заявлений на участие в аукционе указан в условиях проведения аукциона.

**Телефоны для справок: 227 48 36, 222 63 59, 222 48 60.**

## ХТО КОЛЬКІ ЗАРАБІЎ

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені-верасні гэтага года склала Br683 тыс. Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА у Міністэрстве статыстыкі і аналізу рэспублікі, у верасні сярэдняя зарплата склала Br713 тыс.

У галінах бюджэтнай сферы сярэднямесячная зарплата ў студзені—верасні гэтага года склала Br601,4 тыс., у тым ліку ў верасні — Br603,4 тыс. Ва ўстановах аховы здароўя яна склалася ў памеры Br592 тыс., у тым ліку ўрачоў — Br973 тыс., сярэдняга медыцынскага персаналу — Br578 тыс., малодшага медыцынскага персаналу — Br373 тыс. Ва ўстановах адукацыі — Br527 тыс., у тым ліку настаўнікаў — Br624 тыс., прафесарска-выкладчыцкага складу — Br955 тыс. Ва ўстановах навукі і навуковага абслугоўвання гэты паказчык быў роўны Br1 млн 16 тыс., у тым ліку навуковых работнікаў — Br1 млн 73 тыс. Найбольш высокая аплата працы ў верасні гэтага года склалася на прадпрыемствах нафтаперапрацоўчай прамысловасці — Br1 млн 271 тыс., чорнай металургіі — Br1 млн 241 тыс., хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці — Br1 млн 28 тыс., электраэнергетыкі — Br1 млн 19 тыс. Гэта ў 1,6-1,3 раза вышэй, чым у сярэднім па прамысловасці. У арганізацыях транспарту сярэдняя зарплата ў верасні была Br840 тыс., у тым ліку аўтамабільнага — Br724 тыс., чыгуначнага — Br883 тыс., трубаправоднага — Br1 млн 123 тыс., авіяцыйнага транспарту — Br1 млн 132 тыс. У сельскай гаспадарцы — Br452 тыс. (на 37 працэнтаў ніжэй, чым у сярэднім па рэспубліцы).

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.11.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 152,00 |
| 1 еўра | 3 148,81 |
| 1 латвійскі лат | 4 503,03 |
| 1 літоўскі літ | 911,98 |
| 1 чэшская крона | 118,13 |
| 1 польскі злоты | 858,79 |
| 1 расійскі рубель | 87,85 |
| 1 украінская грыўня | 427,51 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 24,4975 |
| 10 UAH | 48,3300 |
| 1000 BYR | 11,3605 |
| EUR | 35,8619 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 19.11.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпісвайцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

Аляксандр ГЛЕБ, капітан нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе:

## «НЕ ВЕРЦЕ ЧУТКАМ — ЗА ЗБОРНУЮ БЕЛАРУСІ Я ЗАЎСЁДЫ ГУЛЯЮ З ПОЎНАЙ САМААДДАЧАЙ»

**Асоба Аляксандра Глеба, як легіянера з лонданскага «Арсенала» і капітана беларускай нацыянальнай футбольнай каманды, без сумненняў, застаецца цікавай заўсёды. Асабліва — пасля пераможнага матча падначаленых Бернда Штанге ў выязным суботнім адборачным матчы супраць албанцаў, дзе беларус паказаў сябе як выдатны арганізатар і адмысловы партнёр у арганізацыі многіх галявых момантаў.**

**На інтэрв'ю пасля матча з зоркай беларускага футбола журналіст «Звязды» дамовіўся яшчэ ў Штутгарце на борце самалёта, таму першае пытанне па дарозе дадому для нашага легіянера не было нечаканасцю.**

***— Саша, перамога над албанцамі і твая ўпэўненая гульня, напэўна, ускосна звязана з тым, што заключны перыяд падрыхтоўкі зборнай праведзены ў Штутгарце, былым тваім месцы «дыслакацыі» ў футбольнай Еўропе?***

— Гэта проста супадзенне. Нам, па вялікім рахунку, было няважна, дзе праходзяць зборы — у Штутгарце ці ў Мінску альбо яшчэ недзе. Мы настройваліся згуляць дастойна і абавязкова выйграць.

***— Што абумовіла выдатна праведзены матч з такім даволі няпростым сапернікам як Албанія?***

— Магчыма, гэта банальна гучыць, але цяперашняя перамога стала магчымай у першую чаргу таму, што ў састаў нацыянальнай каманды вярнуліся Віталь Кутузаў, Саша Кульчы і Віталь Булыга. Дадайце сюды Максіма Рамашчанку — і ў нас атрымоўваецца выдатны касцяк каманды. Ні ў якім разе не хачу прынізіць значэнне іншых ігракоў, тым не менш пералічаныя прозвішчы — гэта аснова нашага поспеху.

***—Атрымоўваецца, што Бернд Штанге дарэмна эксперыментаваў, заганяючы сябе і беларускі футбол у кут?***

— Я не магу асуджаць дзеянні нямецкага трэнера па многіх фактарах. Маўляў, нагарадзіў агарод з увядзеннем моладзі ў склад галоўнай зборнай Беларусі — а потым даў задні ход і вярнуўся да легіянераў. Пэўна, ён хацеў як лепш: паглядзець людзей, якія павінны прыйсці на змену ветэранам, «абстраляць» навічкоў, заклаўшы такім чынам фундамент на будучае. Але ж мне здаецца, што афіцыйныя міжнародныя матчы — не самы зручны момант для такіх рызыкоўных учынкаў. Футбол — гэта не тэніс, дзе лёс матча можа вызначыць адзін чалавек.

***— Саша, відавочна, што пасля сорамнага дамашняга пройгрышу камандзе Люксембурга ў Гомелі многія з балельшчыкаў і журналістаў у думках паставілі крыж на галоўнай камандзе краіны...***

— Мне асабіста таксама было сорамна за вынік той сустрэчы. Праўда, трэба аддаць належнае Штанге — ён, як бы маральна цяжка ні было, сабраў нас і сказаў, што мы павінны перажыць гэты сорам разам... Ведаеце, нешматслоўнасць настаўніка ў той час на многае адкрыла вочы і яму, і яго падначаленым... Усё было зразумела — спачатку добрая гульня і пажадана вынік, а ўжо потым усё астатняе...

***— Пэўна, што табе прыйшлося адчуць колкія позіркі партнёраў па лонданскім «Арсенале».***

— Безумоўна, аднаклубнікі падколвалі, што мы прайгралі работнікам супермаркетаў і цырульнікаў. Але ж у сучасным футболе зараз нямала сенсацый, бо многія каманды, якія яшчэ ўчора былі на задворках футбольнай Еўропы, навучыліся на высокім прафесійным узроўні «ўпраўляць» мячом.

***— Саша, у беларускіх футбольных кругах неаднойчы прыходзілася чуць пра тое, што Аляксандр Глеб у зборнай***



***проста адбывае нумар. Маўляў, вось калі б ён гуляў так, як у «Арсенале»...***

— Не верце такім размовам і розным чуткам: у зборнай я заўсёды выкладваюся на ўсе сто і гуляю з поўнай самааддачай. Безумоўна, здараецца, што дрэнна сябе адчуваеш ці проста нешта не атрымоўваецца. Але ж гэта ні ў якім разе не ўплывае на мой гульнявы настрой.

***— Заўтрашняя гульня з галандцамі на мінскім стадыёне «Дынама» ў многім носіць фармальны характар, бо «аранжавыя» разам з румынамі ўжо забяспечылі сабе выхад у фінальную частку еўрапейскага чэмпіянату-2008. Можна будзе згуляць разняволена, бо груз адказнасці ўжо не цісне...***

— Я так не лічу. Безумоўна, у турнірнай табліцы кардынальна ўжо нічога не зменіш, тым не менш пры пэўным раскладзе мы можам заняць 4-е месца. А яшчэ нам больш важна паказаць прыгожы футбол, каб парадаваць сваіх балельшчыкаў, якіх я прашу прыйсці падтрымаць нас. Акрамя Глеба і Кутузава, для многіх футбалістаў сезон ужо завяршаецца. Таму, не сумняваюся, што завяршыць яго ўсе хочуць на мажорнай ноце.

У рэшце рэшт, як бы гульня ні закончылася, як капітан каманды ўпэўнены, што мы будзем біцца да апошняга і старацца паказаць усё, што ўмеем.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

*Тырана—Мінск.*

**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при администрации Первомайского района г. Минска проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства гаража № 184 (с подвалом) общей площадью 41,8 кв.м, расположенного в ГСК «Фортуна плюс», г. Минск, ул. Ф. Скорины, 50а. Начальная цена — 2 800 000 рублей. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010, Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 21 декабря 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 20 декабря 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к.326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

ТРАДИЦИИ НАДЕЖНОСТЬ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**о проведении внеочередного Общего собрания акционеров Открытого акционерного общества «Белвнешэкономбанк» в заочной форме**

Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк», расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова,32, сообщает о проведении 3 декабря 2007 г. внеочередного Общего собрания акционеров в заочной форме.

**ПОВЕСТКА ДНЯ ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

1. О внесении изменения в устав ОАО «Белвнешэкономбанк».
2. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Ассоциации «Белорусская федерация горнолыжного спорта и сноуборда».
3. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Махортову А.В.
4. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи Управлению образования Заводского района г. Минска.

Список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, составлен на основании данных реестра владельцев акций ОАО «Белвнешэкономбанк», сформированного на 15 ноября 2007 г.

Лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут ознакомиться с решением о проведении Общего собрания акционеров ОАО «Белвнешэкономбанк» в заочной форме, другой необходимой информацией и заполнить бюллетени для заочного голосования, начиная со дня опубликования данного извещения включительно, ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 9.00 до 13.00, по адресу: г.Минск, ул.Скрыганова,6, ком. 707, а также в филиалах ОАО «Белвнешэкономбанк».

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть представлены в ОАО «Белвнешэкономбанк» не позднее 29 ноября 2007г. по адресу: Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Скрыганова, 6, ком. 707, почтой, нарочным либо по факсу (8 017) 209 25 48 с обязательной доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

**Дополнительная информация по телефонам: (8 017)209 24 21, 209 25 40.**

## ВУЧЫМСЯ ЧЫСЦІЦЬ ЗУБЫ

36,6°

**Рэклама зубных пастаў, шчотак, жавальных гумак не сыходзіць з экранаў тэлевізараў. Здаецца, што ты ведаеш ужо амаль усё пра праблемы зубоў. Аднак... На прыёме ў стаматолага ўрач робіць заўвагу: няправільна чысціце зубы, застаецца зубны налёт. Як жа так? Аказваецца, што дарагая паста і «наварочаная» шчотка — гэта толькі палова справы ў барацьбе за здаровыя зубы. Другая палова — стараннае ачышчэнне зубной паверхні.**

Як ні парадаксальна, — і гэта зазначаюць спецыялісты — большасць людзей чысціць зубы не ўмеюць. Як жа правільна гэта рабіць? Вось некалькі агульных парад.

● Памятайце, перад чысткай і пасля яе зубную шчотку трэба абавязкова мыць.

● «Паеў — пачысці зубы або хаця б прапалашчы рот!» — вядомы лозунг стаматолагаў.

● Зубы належыць чысціць не менш як два разы на дзень, раніцай і вечарам (у ідэале — кожны раз пасля яды). Прычым раніцай чысціць зубы пажадана таксама два разы — перад снеданнем (каб зняць налёт, які ўтварыўся за ноч, а разам з ім і бактэрыі) і пасля яго (каб перашкодзіць утварэнню спрыяльнага для бактэрый асяроддзя).

● Працэс ачышчэння павінен доўжыцца не менш як дзве хвіліны. Мала карысці будзе, калі проста правесці шчоткай па зубах пару разоў і на гэтым супакоіцца. Чысціць трэба ўсе паверхні — знешнія, унутраныя і жавальныя, прыкладна па дзесяць рухаў у адным накірунку. Зубная эмаль складаецца з прызмаў і па структуры нагадвае рыбную луску. Калі чысціць зубы так, як мы чысцім рыбу, г.зн. супраць росту лускавінак, ад эмалі праз некаторы час нічога не застанецца. Таму зубы, у адрозненне ад рыбы, трэба гладзіць. Рухі павінны быць ад дзясны: для верхніх зубоў — зверху ўніз, а для ніжніх — знізу ўверх. У процілеглым выпадку ёсць рызыка загнаць мяккі налёт пад дзясну, а вычысціць яго адтуль зможа толькі стаматолаг. Знешнія паверхні бакавых зубоў рэкамендуецца чысціць кругавымі рухамі — гэта дазваляе больш эфектыўна здымаць налёт.

● Акрамя таго, хоць бы раз на дзень (лепш за ўсё на ноч) трэба карыстацца зубнымі ніткамі (флосамі). Шчоткі ачышчаюць рабочую паверхню зуба, а рэшткі ежы назапашваюцца паміж зубамі, да якіх ні адна, нават электрычная зубная шчотка не дабярэцца. Неабходна памятаць: нітку не трэба перамяшчаць з вялікай сілай; яна павінна заўсёды знаходзіцца ў кантакце з паверхняй зуба, каб не выклікаць пашкоджання дзясны.

● Яшчэ адзін дадатковы спосаб чысткі зубоў — ірыгатар, спецыяльны прыбор з накіраваным струменем вады, які прачышчае цяжка даступныя месцы. Але выкарыстоўваць яго варта, калі параіць урач, бо пры пашкоджанні эмалі такая працэдура выклікае непрыемныя адчуванні.

● На працягу дня, калі няма магчымасці пачысціць зубы, можна прымяняць апаласквальнік, ён засцерагае эмаль і робіць дыханне свежым.

● Жавальная гумка таксама сродак гігіены поласці рота. Праўда, жаваць яе можна толькі пасля яды, на працягу 5—10 хвілін (пры больш доўгім жаванні ўсе карысныя ўласцівасці гумкі заканчваюцца).

● Дарэчы, нядрэнна ачысціць зубную паверхню можна з дапамогай... яблыка, морквы і любой іншай цвёрдай садавіны ці агародніны, заадно атрымаўшы неабходныя для арганізма натуральныя вітаміны.

Самы ж дзейсны сродак — прафілактычны агляд у стаматолага, які дасць падрабязныя, падыходзячыя толькі вам рэкамендацыі.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

**Считать недействительным страховой полис** серии BY 1704736 СООО «Белкоопстрах».

## Дабрачынная «Зямля для дваіх»

Муз-news

**Кампазітар і выканаўца Аляксандр Сухараў прадстаўляе праект-акцыю «Зямля для дваіх», якая праходзіць сумесна з дабрачынным грамадскім аб'яднаннем «Лаза», вакальна-эстраднай студыяй «Анна Доміні» пры падтрымцы МУС Рэспублікі Беларусь. Мэта праекта — збор сродкаў для школы-інтэрната г.п. Радашковічы, а таксама прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблем дзяцей-сірот.**

Акцыя праходзіць у некалькі этапаў. З 8 па 17 лістапада з выхаванцамі дзіцячага дома ў Радашковічах працавалі педагогі па вакалу, харэаграфіі, эстраднаму майстэрству, сам Аляксандр Сухараў. Дзеці развучылі некалькі дуэтных кампазіцый з рэпертуару беларускіх выканаўцаў. 17 лістапада ў школе-інтэрнаце прайшоў выніковы канцэрт-конкурс, у якім выступілі педагогі і іхнія выхаванцы. Лепшыя дуэты атрымаюць магчымасць выступіць у фінале праекта разам з зоркамі беларускай эстрады, а ўсе без выключэння ўдзельнікі атрымалі падарункі ад МУС. 24 лістапада адбудзецца фінал — канцэрт «Зямля для дваіх», які пройдзе ў Маладзёжным тэатры эстрады. Назву яму, дарэчы, дала кампазіцыя, напісаная Аляксандрам Сухаравым. Акрамя яго і пераможцаў дзіцячага конкурсу, удзел у канцэрце возьмуць Аляксандр Ціхановіч і Ядвіга Паплаўская, Іна Афанасьева, Вольга Плотнікава, Дзмітрый Смольскі, Віктар Пшанічны, Алена Грышанава, Леся Кодуш і Слава Нагорны, Галіна Шышкова, Аляксандр Патліс, Дзмітрый Сяргееў, Вікторыя Алешка і іншыя артысты. Разам з імі на сцэну выйдуць прадстаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый — таксама з падарункамі для выхаванцаў дзіцячага дома. Прымеркавана гэта акцыя да Года маці і Сусветнага дня дзіцяці (20 лістапада).

## Юбілейны рок-эксперымент

**2 снежня прадставіць сваім прыхільнікам новую праграму «Лірыка» Зміцер ВАЙЦЮШКЕВІЧ.**

Прымеркаваны альбом адразу да двух юбілеяў: па-першае, гэта 10-я пласцінка выканаўцы, па-другое, сёлета ён адзначае 15 гадоў сцэнічнай дзейнасці. Магчыма, таму і адбыліся заўважныя змены ў стылі музыкі: гучанне «Лірыкі», нягледзячы на назву — на дзве трэці рокавае. «Я і сам здзівіўся, як так атрымалася! Для маёй творчасці гэта нават рэвалюцыйна, — распавядае Зміцер. — Здрадзіў сам сабе і прыхільнікам, ударыўшыся ў рок. Цяпер з нецярпеннем чакаю прэзентацыі, каб зразумець, як людзі адрэагуюць на гэтыя змены».

У альбом увайшлі 13 трэкаў, усе, як і водзіцца звычайна ў Вайцюшкевіча, — пра жыццё і пра каханне. Усе — на вершы паэта Генадзя Бураўкіна, творчасць вядомая кожнаму з нас з дзяцінства — гэта яму належаць словы да «Калыханкі», «Завірухі», «Зачараваная мая» і іншых хітоў. Сам паэт, дарэчы, мае намер таксама ўзяць удзел у прэзентацыі.

**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## «Мамант-2007»: сімбіёз мастацтваў





**У Нацыянальнай школе прыгажосці адбыўся X юбілейны фестываль авангарднай моды «Мамант-2007». У рамках фестывалю акрамя конкурсу маладых дызайнераў адзення прайшлі выставы сучаснага мастацтва, скульптуры і фота, конкурс бодзі-арта. Паказы гасцявых калекцый і майстар-класы правялі Іван Айплатаў, Арцемій Троіцкі і іншыя.**

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**



## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.46 | 16.04 | 8.18 |
| Віцебск — | 7.41 | 15.48 | 8.07 |
| Магілёў — | 7.36 | 15.54 | 8.18 |
| Гомель — | 7.26 | 15.58 | 8.32 |
| Гродна — | 7.59 | 16.20 | 8.21 |
| Брэст — | 7.53 | 16.28 | 8.35 |

### Месяц

*Першая квадра 18 лістапада. Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

*Пр. Валерыя, Кірылы, Міхаіла, Фёдара, Фядота, Яўгена;*
*К. Анастасіі, Эдзіты, Анатоля, Фелікса.*

## НАДВОР'Е на заўтра




— слабая геамагнітная бура
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

Геамагнітныя ўзрушэнні

2 гадз. | 5 гадз. | 8 гадз. | 11 гадз. | 14 гадз. | 17 гадз. | 20 гадз. | 23 гадз.

### ...у суседзяў

ВАРШАВА +1..+3°C
КІЕЎ 0..+2°C
РЫГА +2..+4°C
ВІЛЬНЮС 0..+2°C
МАСКВА -6..-4°C
С.-ПЕЦЯРБУРГ +2..+4°C

## Сустрэчы ў Магілёве рускай імператрыцы Марыі Фёдараўны

**У Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстава, прысвечаная імператрыцы Марыі Фёдараўне, маці Мікалая Другога.**



90 гадоў таму менавіта ў Магілёве адбылася апошняя сустрэча маці і сына. Марыя Фёдараўна прыехала на персанальным цягніку з Кіева і прабыла ў Магілёве пяць дзён. Яна імкнулася падтрымаць Мікалая, які быў, як яна пісала ў сваіх дзённіках, «як сапраўдны пакутнік, які схіліўся перад непазбежным». Цяпер гісторыкі гавораць, што Марыя Фёдараўна тады блаславіла сына на яго хросны шлях...

Магілёўская выстава называецца: «Імператрыца Марыя Фёдараўна — веліч лёсу». Яна расказвае пра жыццё гэтай жанчыны. Як дацкая прынцэса Дагмар стала жонкай рускага імператара Аляксандра III, прыняла праваслаўе і атрымала новае імя — Марыя Фёдараўна. Як параход, на якім прынцэса адправілася ў Расію, праводзіў Ганс-Хрысціян Андэрсен, якога прымалі ў дацкай каралеўскай сям'і.

Дарэчы, на выставе можна пабачыць прыжыццёвае выданне дацкага казачніка, датаванае 1867 годам. А таксама макет кнігі Андэрсена «Казка пра трох белых мішак» з ілюстрацыямі дачкі Марыі Фёдараўны, княгіні Вольгі Аляксандраўны. Макет выраблены ў 1938 годзе, а цяпер кнігу збіраюцца надрукаваць у Маскве.

Экспанаты, а таксама і шматлікія фотаматэрыялы пра жыццё рускай імператарскай сям'і і дацкай каралеўскай, прадставіла культурнае таварыства «Дагмарыя» з Капенгагена. Гэта невялікае кола людзей, якія з'ехалі ў Данію з Савецкага Саюза і, пазней, з постсавецкіх краін. Яны ўтварылі таварыства ў гонар Марыі Фёдараўны і назвалі яго спалучэннем з дацкага і рускага імёнаў імператрыцы.

Адна з удзельніц «Дагмарыі» спецыяльна прыехала ў Магілёў на адкрыццё выставы. Наталля Булдава-Бак — ураджэнка Беларусі, мінчанка, больш за дзесятак гадоў таму яна выйшла замуж за датчаніна і з'ехала. Яна працуе ў банку, а ў вольны час разам з сяброўкамі займаецца гістарычнымі расследаваннямі і захаваннем памяці пра Марыю Фёдараўну.

— Сёлета спаўняецца 160 гадоў з дня нараджэння імператрыцы, — нагадала Наталля. — Яна займалася дабрачыннасцю, апеквала Чырвоны Крыж, кадэцкія школы. Марыя Фёдараўна мела выдатныя якасці характару, якія выклікалі павагу і сімпатыю ў людзей. Яна і ў сваіх дзецях выхоўвала прастату, шчырасць, добразычлівасць. І яшчэ яна глыбока верыла ў Бога і заўсёды спадзявалася на яго волю.

На адкрыцці выставы хор магілёўскіх дзяўчынак выканаў гімн у гонар імператрыцы Марыі Фёдараўны, які быў напісаны Міліем Балакіравым у 1898 годзе. Пра імператрыцу прамаўлялі гісторыкі, прадстаўнікі беларускага казацтва (казакі былі адданымі ахоўнікамі Марыі Фёдараўны) і Чырвонага Крыжа.

Дарэчы, менавіта Марыя Фёдараўна была апякункай першага ў Магілёве Александрынскага таварыства міласэрнасці, пры яе ўдзеле была пабудавана Магілёўская земская бальніца Чырвонага Крыжа, будынак якой і цяпер захаваўся ў складзе гарадской бальніцы хуткай дапамогі.

Экспазіцыя выставы ў Магілёве пачынаецца з партрэтаў Марыі Фёдараўны і Мікалая Другога — у гонар той далёкай апошняй сустрэчы. А завяршаецца фатаздымкамі падзеі, якая адбылася летась. Імператрыца памерла ў Даніі ў 1928 годзе і яе прах захоўваўся ў Каралеўскім магільным склепе. Але Марыя Фёдараўна завяшчала пахаваць сябе побач з мужам. Яе запавет выкананы: астанкі імператрыцы перапахаваныя ў Санкт-Пецярбурзе.

А ў магілёўцаў ёсць магчымасць даведацца пра жыццё імператрыцы і дакрануцца да яе асобы.

— Яна не пакідае мяне абыякавай, — расчулена сказала на адкрыцці выставы Наталля Булдава-Бак. — Спадзяюся, што і ў вашых сэрцах знойдзецца куточак для Марыі Фёдараўны.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Дзве даты — 20 лістапада



**1717 год** — нарадзіўся Георгій Каніскі, беларускі царкоўны і грамадскі дзеяч, пісьменнік, епіскап магілёўскі (беларускі). Актыўна выступаў за захаванне і ўмацаванне праваслаўя. Пасля трох замахаў вымушаны быў выехаць у Расію, дзе заставаўся магілёўскім епіскапам у выгнанні. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай вярнуўся на радзіму, напісаў шэраг рэлігійных твораў, якія высока ціаніў А. Пушкін. Канаізаваны Беларускай праваслаўнай царквой.

**1945 год** — пачаўся Нюрнбергскі працэс супраць лідараў фашысцкай Германіі. Да адказнасці былі прыцягнуты галоўныя нацысцкія ваенныя злачынцы: Г. Герынг, В. Кейтэль, Э. Кальтэнбрунер, А. Йодль, А. Шпеер, Г. Круп і іншыя. На Нюрнбергскім працэсе ўпершыню ў гісторыі агрэсія была прызнана найцяжэйшым злачынствам супраць чалавецтва.

### Цытата дня:

***«Чаго няма сёння, тое будзе заўтра: у гэтым усё жыццё праходзіць».***

**Петроній (21—66), старажытнарымскі пісьменнік.**

## Усміхнёмся!

Два сябры.
— І чаго ўсміхаешся, ты ж учора машыну пабіў?
— Так.
— Бампер зламаў.
— Так.
— Шкло пабіў.
— Так.
— Цешча яшчэ галавой стукнулася.
— Во-о-сь...

☺

**Да тых каналаў ТБ, якія былі, падключылі яшчэ 35. Глядзець няма чаго стала значна больш.**

Уважаемые акционеры ОАО «Ресторан «Беларус»!
29 ноября 2007 года в 15.00 состоится внеочередное собрание акционеров ОАО «Ресторан «Беларус».
***Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Сторожевская, 15 А.***

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

**1. Освобождение члена ревизионной комиссии и доизбрание членов ревизионной комиссии.**

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Сторожевская, 15 А с 26.11.2007 г. (время работы с 9.00 до 18.00 по месту проведения собрания).

Регистрация участников собрания с 13.00 до 15.00 29.11.2007 г. по адресу проведения собрания акционеров. Для регистрации при себе иметь документ, удостоверяющий личность (представителю акционера — и доверенность, заверенную в Комитете по ценным бумагам при Совете Министров РБ).

Уважаемые акционеры ОАО «Лидсельмаш»!
**30 ноября 2007 года**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Лидсельмаш», расположенного по адресу:**
**г. Лида, ул. Советская, 70.**

**Повестка дня собрания:**

**1. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.**

Начало работы собрания в 11.00.
Регистрация участников собрания с 9.30 до 10.50.

**Наблюдательный совет ОАО «Лидсельмаш».**

**Утерянные бланки страховых полисов Белгосстраха** по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН серии БЛ №№ 378551, 370360 **считать недействительными.**

**«ПРИОРБАНК»**
**Открытое акционерное общество**
**извещает своих акционеров, что 4 декабря 2007 года**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров банка**
***Собрание состоится в г. Минске по адресу: ул. В. Хоружей, 31А***

Регистрация участников будет осуществляться с 8.00 до 8.30. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим служебное положение).

**Повестка дня**

***1. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи Республиканскому научно-исследовательскому унитарному предприятию «БелНИЦ «Экология».***

**Наблюдательный Совет «Приорбанк» ОАО.**

**Утерянный бланк страхового полиса Белгосстраха** по добровольному страхованию от несчастных случаев формы 2РН серии БЛ № 1244650 **считать недействительным.**

**У суд Фрунзенскага раёна г. Мінска** паступіла заява ад УП «ЖЭС № 115 ЖРЭА-1» Фрунзенскага раёна г. Мінска аб прызнанні памерлым ЗАБЭЛА Леаніда Яўгенавіча, 7 верасня 1947 года нараджэння, апошняе вядомае месца пражывання і знаходжання: г. Мінск, вул. Лабанка, д. 17, кв. 3. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Забэла Леаніда Яўгенавіча, паведаміць іх суду Фрунзенскага раёна г. Мінска (г. Мінск, вул. Д.-Марцінкевіча, д. 1, корп. 2) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым ТАМАШЭНКІ Уладзіміра Васільевіча, 12 сакавіка 1959 года нараджэння, ураджэнца в. Хатуча Брагінскага раёна Гомельскай вобласці, які пражываў па адрасе: Гомельская вобл., г. Рэчыца, вул. Пушкіна, д. 8, кв. 1. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Тамашэнку Уладзіміра Васільевіча, паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна Гомельскай вобл. на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**У суд Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак МАР'ЯШЫНА Віктара Мікалаевіча, 8 снежня 1958 года нараджэння, ураджэнца г. Масквы Расійскай Федэрацыі, які ў студзені 2002 года пайшоў з дому і да гэтага часу звестак аб ім няма. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Мар'яшына Віктара Мікалаевіча, паведаміць іх суду Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении повторного открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Заславле**
Арендодатель — Заславский городской исполнительный комитет; Организатор аукциона — КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Целевое назначение земельного участка | Площадь земельного участка | Срок аренды земельного участка | Характеристика расположенных на участке сооружений и инженерных коммуникаций | Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | г. Заславль, микрорайон 2 | 641500000001002345 | для строительства административно-деловых помещений | 0,0562 га | 50 лет | земельный участок свободен от застройки | 25 915 000 руб. |
| 4 | г. Заславль, ул. Центральная | 641500000001001891 | для строительства торгового павильона | 0,0497 га | 10 лет | земельный участок свободен от застройки | 7 360 000 руб. |
| 6 | г. Заславль, ул. Дехновка | 641500000001002340 | для установки киоска с остановочным пунктом | 0,0055 га | 5 лет | земельный участок свободен от застройки | 3 295 000 руб. |

Аукцион состоится 04.12.2007 года в 15.00 по адресу: г. Заславль, ул. Великая, 1, актовый зал Заславского горисполкома. Размер задатка по каждому лоту составляет 10 % от начальной цены и перечисляется на р/с 3012020200010, Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор аренды земельного участка подписывается с победителем аукциона в 20-дневный срок со дня проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион проводится со следующими условиями: победитель аукциона обязан в течение 3 (трех) месяцев с момента ввода объекта в эксплуатацию зарегистрировать юридическое лицо в г. Заславле, оформить материалы предварительного согласования места размещения земельных участков для строительства инженерных коммуникаций к объекту строительства и оплатить стоимость предмета аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня получения протокола о результатах аукциона. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 03.12.2007 года до 17.00 по адресу: г.Минск, ул.Чкалова, д. 5, ком. 322.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

**Віншуем з днём нараджэння дарагога бацьку, дзядулю і свёкра Васіля Савіча САВАШЫНСКАГА з г. Століна.**

*Желаем много лет прожить,*
*Печали, горести не зная,*
*Пусть Ангел жизнь вашу хранит,*
*А Бог во всем вам помогает.*

**З павагай сын, нявестка, унук Руслан.**

**Шчыра віншуем з юбілеем Галіну Віктараўну РЫЖЭВІЧ *з в. Ракаўцы.***

*Хай кожны год — як колас жыта*
*Заўсёды радасны, багаты,*
*А кожны дзень,*
*табой пражыты,*
*Каб падарункам быў і святам.*

**Родныя.**

КІРМАШ штотыднёвы рэкламны выпуск № 35 (568)

аддзел рэкламы ☎ 287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПРАДАЕЦЦА

■ Дом цагляны 60 кв.м без выгод, зямельны ўчастак 1 га ў Старадарожскім раёне.
Тэл. 8 01792 58 823.

■ Дом у г. Узда.
Тэл. 8 01718 55 217.

■ Вялікі драўляны дом у в. Чабусы Любанскага раёна, маюцца г/п, сад, агарод 60 сотак, добрыя транспартныя зносіны.
Тэл. 8 01742 61 645.

■ Дом цагляны ў в. Грэск Слуцкага раёна, г/п, участак 22 соткі.
Тэл. 8 029 177 75 69.

■ Дача, 40 км ад Мінска, Брэсцкі напрамак.
Тэл. 8 01716 64 931.

■ «Фіят-Брава» 1999 г.в., 1,4Б, серабрысты металік.
Тэл.: 8 01772 58 505, 8 029 360 28 85.

■ Гараж па вул. Машынабудаўнікоў у г. Мінску ці здам у арэнду.
Тэл. 8 017 285 57 29.

■ «VW-Вента» 1993 г.в., 1,9ТД, сіні, нядорага.
Тэл. 8 029 931 82 28.

■ «Опель-Кадэт» 1988 г.в., 1,3Б, чорны, 1100 у.а., торг.
Тэл. 8 029 661 77 49, 8 033 602 06 27.

■ Газавая пліта новая (брэсцкая).
Тэл.: 8 017 295 96 84, маб. 115 56 99.

■ Кабан жывой вагой 160 кг, 5 тыс. руб. за 1 кг.
Тэл. 8 029 507 58 61.

■ Плуг, вупраж, воз конны, сена, пральная машына «Волна» з цэнтрыфугай.
Тэл. 8 01794 46 235.

■ Матацыкл «Днепр-11» у выдатным стане.
Тэл. 8 01795 76 223.

■ Мыйка нержавеючая, б/к, 80х60 см, радыятар да «Аўдзі-80» 1991 г.в.
Тэл. 8 029 873 47 07.

■ Касілка навясная да трактара Т-25, Т-16.
Тэл. 8 029 699 80 87.

■ Халадзільнік «Атлант», тэлевізар «Віцязь», ч/б, усё новае, нядорага.
Тэл. 8 029 378 15 36.

■ Свіння вагой 120 кг, 5 тыс. руб. за 1 кг.
Тэл. 8 01718 42 445, пасля 18.00.

### КУПЛЮ

■ Дом-дачу з усімі камунікацыямі і ацяпленнем да 30 км ад Мінска.
Тэл. 8 029 767 33 65.

■ Старыя фотаапараты, аб'ектывы, значкі і паштоўкі па фотатэматыцы.
Тэл. 8 029 850 17 29.

■ Грузавы ЗіЛ-130 з дызельным рухавіком.
Тэл. 610 75 58.

■ Трактар МТЗ.
Тэл. 8 029 655 07 16.

■ Жыллё ў Мінску ці Мінскім раёне без пасрэднікаў.
Тэл.: 764 42 91, 704 27 25.

■ Дом у вёсцы ці на хутары не далей як 70 км ад Мінска.
Тэл. 8 029 357 64 51.

ЗВЯЗДА

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.**

| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.**

**Тэлефон для даведак 287 17 79.**

Пашпарт серыя__________________ № ________________ Выданы________________________

Подпіс__________________ Дата____________________

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**
**Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.**
**Тыраж 32.347. Індэкс 63850. Зак. № 6303. Нумар падпісаны ў 19.30.**
**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**
**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**